Какие предложения в программу по развитию Альбертина внесли бы слонимчане и сами жители этого микрорайона, «ГС» спросила у подписчиков группы «ВКонтакте». Приводим некоторые ответы.

Даниил:

—Нужно обустроить парк. Можно разместить загс в главном здании (бывшем имении), в другом — дворец молодёжи Альбертина. Неплохо было бы установить фонтан на малой площади, в центре которой поставить статую женщины с ребёнком (теперь она стоит у главного здания).

Очистить озеро, сделать набережную, отремонтировать дороги к микрорайону. В том месте, где сквер с памятником Ленину, сделать площадь. Ее можно назвать, например, площадью Победы. Поставить пару высоток, чтобы увеличить количество молодёжи, так как теперь в основном там живут одни старики. И еще. Говорят, что в озере утоплена статуя то ли какой-то женщины, то ли самого Пусловского, владельца усадьбы, которую спрятали в озере во время войны. Так вот, нужно достать ту статую из озера.

Наташа:

—Плюсую первый комментарий. А ещё хотелось бы баскетбольную площадку. По сути, баскетбольная площадка там уже есть. Просто ее нужно немного отремонтировать. Теперь в Альбертине нет ни одной нормальной спортивной площадки. Это не дело.

Катя:

—Даниил, идея с фонтанами и загсом просто отличная. Но вот насчет благоустройства пляжа идея не очень, ибо это озеро техническое, то есть вырыто специально для обеспечения КБЗ водой. Там глубина достигает 20 метров, что может быть небезопасно.

Даниил:

—Катя, это озеро не вырыто для КБЗ, просто завод поставил дамбу, а так это озеро естественное. В XIX веке граф Пусловский в нашем районе открывал заводы, и ему приглянулось это озеро. Он и построил там усадьбу, которая стоит и сейчас. Во время графа на озере ходили малые баржи и лодки, в центре его был маленький остров с беседкой, на который можно было приплыть. Но после остров ушёл под воду. Микрорайон назван в честь его рано умершего сына Альберта, а также с графом связано предание о Расколотом камне, который находится в нескольких километрах от усадьбы.

Озеро можно обустроить не как зону для купания, а как зону отдыха с прокатом лодок, катамаранов. Дамба вдоль берега с ограждением для прогулок сейчас находится в ужасном состоянии, а раньше, в 80-90-е, это было излюбленное место горожан. Там было кафе. Пейзаж украшали и лебеди, которые жили на озере.

Для купания сойдёт и водопад, который находится около дамбы. Попасть в него можно через туннель — очень полезно, кстати, постоять под водой, вливающейся туда. Но не путайте со шлюзами, которые там есть. То место подойдёт для купания. Замечу, что только у нас в постсоветских странах мраморные львы и вазы стоят неухоженные под открытым небом.


Въездные ворота бывшего имения Пусловских отреставрировали недавно


Каменные львы, которые помнят принцев и императоров

Юлька:

—Было бы неплохо, если бы построили нормальный магазин. А то из-за отсутствия конкуренции цены существенно отличаются от цен в слонимских супермаркетах.

Maria:

—Юлька, полностью согласна. Магазина там не хватает.

Андрей:

—Цена одного килограмма колбасы Слонимского мясокомбината в «Звездном» — 100 тысяч рублей, в супермаркетах — 130-150 тысяч за килограмм такой же колбасы. Цены в Альбертине ведь ниже…

Андрей:

—Я уже предлагал построить в Альбертине площадку Workout и баскетбольную площадку, а толку нет. Все равно райисполком не ответит.

Vika:

—Нашей молодежи некуда сходить отдохнуть. Работал как-то бар, и тот закрыли. Места для отдыха нет. Дороги ужасные, мост вообще скоро развалится. Стадион в ужасном состоянии. Работы много. Но на это все денег нет. Печально.

Жанна:

—Vika, а лыжероллерную трассу, которую обещали на протяжении лет пяти, построили или нет?

Vika:

—Жанна, скажу только так: обещали много чего. Но ничего не делают.

Наталья ИВАНОВА
Фото
Алёны АЛЬКО

ИМ ОТКРЫЛИ МИР ЗНАНИЙ



Юные ученики на празднике посвящения в первоклассники



Ученики 1 «В» класса с классным руководителем Натальей Ковальчук

Совсем недавно мамы и папы провожали своих детей в первый класс. Столько было волнений, забот и хлопот. И вот, спустя месяц, их дети стали настоящими первоклассниками.

На минувшей неделе в учебных заведениях Слонима прошли торжественные мероприятия по случаю посвящения самых юных учеников в первоклассники. Они погрузились в мир знаний.

В 1 «В» классе ученики классного руководителя Наталью Николаевну Ковальчук называют мамой. И на посвящении учеников в первоклассники ведущие праздника представили ее классной мамой.

Одна из родительниц в разговоре заметила, что у них классный руководитель — замечательный учитель, и класс дружный, и родители сплоченные.

Первый школьный праздник провели оригинально: родители преподнесли ученикам огромный торт. Первые школьные каникулы они также решили отметить незабываемо в одном из развлекательных заведений Слонима.

О ТОМ, КАК УЧИТСЯ В ШКОЛЕ, РАССКАЗЫВАЮТ САМИ УЧЕНИКИ 1 «В» КЛАССА СШ №8



Анна Салейко:

— Мне нравится учиться в школе. Надо хорошо учиться, получать «десятки» и слушать учителя.



Анна Казелецкая:

— Я очень люблю учиться в школе. У меня очень хорошая учительница — Наталья Николаевна. Я ее так же люблю, как свою маму и папу.



Екатерина Кудравец:

— Мне в школе нравится писать, считать. У меня есть старшая сестра, которая тоже учится в школе, в 6-м классе.



Виктория Овсяник:

— Мне очень нравится учиться в школе. Особенно я люблю писать. В школе лучше, чем в детском саду.



София Полуносик:

—Я люблю учиться в школе. Люблю свою маму и папу. Также мне нравится писать, читать, цифры называть, одни «десятки» получать.



Андрей Емельянчук:

— В школе очень интересно. Я люблю писать, рисовать, играть, книги разные читать.



Александр Керус:

— Мне в школе хорошо, из всех предметов мне нравится математика.

Анна ВОЛОДАЩУК
Фото автора

ПУТЬ К БОГУ

«...В МАЛОМ ТЫ БЫЛ ВЕРЕН, НАД МНОГИМ ТЕБЯ ПОСТАВЛЮ...»

С такими словами обращается к своему рабу господин из так называемой притчи о талантах. Рассказывая эту притчу своим ученикам, Господь прямо говорит, что, придя второй раз на землю, поступит так же, как поступил господин из этой притчи со своими рабами.

Что же такое талант в евангельском понимании? Это достаточно крупная мера серебра (весом более 26 килограммов). В русский язык слово пришло из французского, где оно уже имело одно из значений — «талант, одаренность», во французский — из латинского, ну а в латинский — из греческого.

Итак, отправляясь в дальнюю страну, господин оставляет своим рабам таланты: одному — пять, другому — два, а третьему — один. Сказано также, что он «поручил им имение свое» (Мф.25:14). И вот, рабы, получившие пять и два таланта, вкладывают их в торговлю и получают прибыль, равную своему вложению. Про третьего же раба сказано, что он «скрыл серебро господина своего». Возвращается господин и требует у рабов отчета. Двое первых, вернув серебро с лихвой, были похвалены домовладельцем: «Хорошо, добрый и верный раб! В малом ты был верен, над многим тебя поставлю; войди в радость господина твоего» (Мф.25:21). Третий же раб пытается оправдаться перед хозяином за то, что не употребил серебро в дело: «Господин! Я знал тебя, что ты человек жестокий, жнешь, где не сеял, и собираешь, где не рассыпал, и, убоявшись, пошел и скрыл талант твой в земле...» (Мф.25:24-25).

И что же слышит он в ответ? Обвинение в лукавстве и лености! Хозяин забирает у него талант и отдает... имеющему десять талантов, «ибо всякому имеющему дастся и приумножится, а у неимеющего отнимется и то, что имеет...» (Мф.25:29).

Евангелие открывает нам мотив поступка третьего раба: страх. Убоявшись гнева господина, он не идет к торгующим и не пытается получить прибыль. Возможно, он опасался потерять то, что уже имел, но, как бы то ни было, хозяин остался недоволен.

Удивительно, что слово «талант» в этой притче понимается как раз таки во втором значении. Все мы имеем от Бога дарования, но распоряжаемся ими абсолютно поразному. Причем «талант» — это не только то или иное свойство, но также и обстановка, в которую мы попадаем, люди, которые нас окружают и многое другое. Употребляем ли мы все это на пользу своей душе или во вред? Ведь для Бога главное сокровище — это наша душа. Христос говорит в Евангелии о том, что человеку нет никакой пользы, если он приобретет весь мир, а душе своей повредит. Так что все таланты наши должны приводить к главному — исполнению Заповедей Божьих и приумножению духовного богатства — любви в нашей душе. И пусть каждый решает для себя сам, на которого из трех рабов он желает быть похожим. Не будем только забывать о том, что «кому больше дано, с того больше спросится» и что «совершенная любовь изгоняет страх» (1 Ин.4:18)!

Оксана КОЗЛОВА

ГРАМАДСТВА

ПАЛОВА ВАКАНСІЙ У СЛОНІМЕ ПРАПАНУЕ ЗАРОБКІ Ў 2-3 МІЛЬЁНЫ РУБЛЁЎ

На слонімскім рынку працы ў верасні прапаноўвалася 125 вакансій, мелася 234 свабодныя месцы. Толькі пятая частка ад вакансій абяцала сярэдні намінальны заробак па Слонімскім раёне — 5 мільёнаў 250 тысяч. Палова працадаўцаў заяўляла зарплаты ад 2 да 3 мільёнаў рублёў.

Запатрабаваныя прафесіі

У верасні ў Слонімскім раёне, згодна з інфармацыяй агульнарэспубліканскага банка вакансій, працу маглі знайсці будаўнікі, медыкі, настаўнікі і работнікі іншых сфер.

Слонімская раённая бальніца, напрыклад, ужо некалькі месяцаў запар шукае дактароў — стаматолагаў, гінеколага, псіхатэрапеўта, а таксама медыцынскіх сясцёр у вясковыя дзіцячыя садкі і паліклінікі горада. Такіх спецыялістаў бальніцы патрэбна ў колькасці трох дзясяткаў, сярод якіх шэсць вакансій дактароў.

Слонімскі кардонна-папяровы завод мог прыняць у верасні на працу 11 чалавек — слесараў, трактарыстаў, электраманцёраў, размольшчыкаў і прасаўшчыкоў.

Слонімскаму мясакамбінату патрабаваліся два слесары і шэсць прыбіральшчыкаў (для часовага пераводу працаўнікоў прадпрыемства). Восем чалавек маглі ў верасні працаўладкаваца на камвольна-прадзільную фабрыку — інжынер і аператары, электраманцёр і слесары.


Упраўляючая кампанія холдынгу «Зодчы» не адмовіла б у працы 75 будаўнікам розных спецыяльнасцяў і галоўнаму механіку. Слонімскі вінзавод шукаў слесара па КІПіА, а аўтобусны парк — аператара заправачнай станцыі і майстра.

Ляснік у Альбярцінскае лясніцтва і машыніст тралёвачнай машыны патрабаваўся ў лягсас, афіцыянт і прадавец — у ААТ «Белы рамонак».


Сельгаскааператывы сёння маюць патрэбу ў аператарах машыннага даення і жывёлаводах, брыгадзірах і аграномах, а ўстановы культуры — у работніках творчых спецыяльнасцяў: балетмайстрам, хормайстрам і рэжысёрам на паўстаўкі можна працаўладкавацца ў цэнтр культуры і адпачынку, артыстам — у драматычны тэатр.

Колькасць вакансій (на поўную стаўку) у грашовым выражэнні





Адукацыя запатрабаваных працаўнікоў



Грашовыя вакансіі

Найбольшы заробак сярод прапанаваных вакансій — 7 мільёнаў рублёў — з даўняга часу абяцае сялянска-фермерская гаспадарка «Раса-Агра» галоўнаму аграному.

На другім месцы ў грашовым рэйтынгу стаіць заробак у 6 мільёнаў. Яго прапануюць дзве вакансіі — у той жа «Расе-Агра» трактарысту-машыністу і трактарысту з катэгорыяй «Е» «F» у СВК «Дзераўноўскі».

Па 5 мільёнаў будуць плаціць машыністу тралёвачнай машыны ў лягсасе, ветурачу ў СВК «Сянькоўшчына», будаўнікам у «Зодчым», аграному і вадзіцелю ў гаспадарцы «Раса-Агра».

Палова ж вакансій прапаноўвае слонімцам мінімальны заробак — ад 2 да 3 мільёнаў рублёў — 53 з 104 прапанаваных на поўную стаўку. Трэцюю частку ад вакансій складаюць заробкі ад 3 да 5 мільёнаў. Ад 5 да 7 мільёнаў — а гэта сярэдні налічаны заробак у жніўні па Слонімскім раёне — толькі пятая частка.

Адсутнасць адукацыі для працаўладкавання не перашкода

Без адмысловай адукацыі працу ў Слонімскім раёне знайсці даволі проста — трэцяя частка вакансій працоўнага рынка не заяўляе нейкай спецыяльнай адукацыі, акрамя агульнай сярэдняй. Вышэйшую адукацыю павінен мець амаль кожны пяты з працаўнікоў.

Наталля ІВАНОВА
Інфаграфіка аўтара

КУЛЬТУРА

САМАТКАНЫ ЦУД З БЕЛАСТОЧЧЫНЫ РАЗГАРНУЛІ Ў СЛОНІМЕ

У Слоніме праходзіць выстава польскіх ручнікоў.

У выставачнай зале Слонімскага раённага краязнаўчага музея імя І.І. Стаброўскага 30 верасня адбылася прэзентацыя выставы «Таямнічы ручнік». Выстава будзе праходзіць цэлы месяц, да 30 кастрычніка.

Экспазіцыя складаецца з холдараў — падставак з фотаздымкамі старажытных і сучасных польскіх ручнікоў ручной працы. Акрамя таго, выставу дапаўняюць і ручнікі XX стагоддзя са Слонімскага раёна.

Галоўнай асаблівасцю ручнікоў з`яўляецца вышыўка, і часцей за ўсё гэта вышыўка крыжыкам. Махры таксама ручной працы — вязаныя кручком або спіцамі.

Ручнікі выконвалі немалаважную ролю ў жыцці людзей. Без гэтай саматканай рэчы нельга было ўявіць цырымоніі сватаўства і вясельнага абраду. Ручнік як сімвал трываласці сужэнства — мяжа для маладых, якія, пераступаючы, пакідаюць сваё дзявоцтва і кавалерства ды бяруць шлюб. Раней таксама лічылася, што калі па радзіха трымаецца за падобны ручнік, то гэта надае ёй сілы разрадзіцца. У агульным сэнсе з такімі ручнікамі пачынаўся жыццёвы шлях нованароджанага і для нябожчыка — заканчваўся.


Супрацоўнік музея Аліна Процак (злева) расказвае пра выставу

Больш падрабязна пра гісторыю ручнікоў можна даведацца на выставе.

Кошт квіткоў для дзяцей — 5 тысяч рублёў, а для дарослых — 10 тысяч, для экскурсійных дзіцячых груп — 20 тысяч, дарослых — 40 тысяч рублёў.

Алена АЛЬКО
Фота аўтара

ФОТОФАКТ

КАК БУДТО БЫ И НА ВИДУ...



Джунгли в городе

Центральные улицы Слонима сегодня в основном благоустроены. Однако и в центре города попадаются такие места, как на улице героя войны Гнидаша возле рынка.

Вроде бы эти места у всех на виду, и в то же время их коммунальные службы обходят вниманием. В результате такой вид приобретают наши городские улочки. Ну просто джунгли какие-то...

Валерий СОЛОДУХО
Фото автора

КУБОК РЕГИОНОВ – 2015 ПО ФУТБОЛУ

УСТУПИЛИ В КЛАССЕ

«ЗВЕЗДА» (МАРЬИНА ГОРКА) — «СЛОНИМ-СИТИ» — 6:0 (3:0)
4 октября. г. Марьина Горка. Стадион ФОЦ «Виктория», 300 зрителей.
«Слоним–Сити»: Рупшис С. (Комлев, 72) – Берг Влад., Шикуть (Лойко, 70), Солдатенко, Кутищев (Романюк, 75), Молчанов (к) (Кечко, 66), Мандрык, Нагорный, Спасюк (Дегиль, 46), Виктор Берг, Руденко (Емельянчик, 69).
Тренер – Руслан Корнев

Слонимчане впервые приняли старт в подобных соревнованиях.

Региональный кубок в стране набирает обороты среди любителей футбола. В 1/4 финала в соперники «Слоним-Сити» достался лидер второй лиги из Марьиной Горки, команда одной ногой в ранге повышения. И в этих соревнованиях соперники ставят самые высокие цели, так как победа в республиканском розыгрыше даёт право на участие в европейских кубках среди любительских команд.



Проиграли в Марьиной Горке

Встреча началась на встречных курсах. В первой же атаке гости имели хороший шанс отличиться, но Дмитрий Шикуть с близкого расстояния не попал по мячу. Вскоре за дело взялись хозяева, они постепенно расшатали оборонительные порядки гостей, нашли уязвимые места и стали претворять атаки в забитые мячи. Были неплохие атаки и завершения в исполнении «Слоним-Сити», но удары приходились мимо цели, или на пути мяча вставал вратарь.

С приходом второго тайма игра гостей стала улучшаться, но не было завершающего удара. Несколько моментов для взятия ворот упустили Виктор Берг, Александр Нагорный, Сергей Мандрык, Денис Руденко. Не забиваешь ты — забивают тебе. Так и случилось. Мастерство хозяев при завершении атак в разы оказалось выше, чем у гостей.

Проведённые замены не добавили прогресса в игре, а всего лишь поддержали начатое.

Ответный поединок состоится в Слониме 14 октября.

Егор ЖИГАЛИК
Фото автора

ЮНОШЕСКОЕ ПЕРВЕНСТВО РЕСПУБЛИКИ ПО ФУТБОЛУ

ПОРАЖЕНИЕ И НИЧЬЯ

Состоялись очередные игры юношеского республиканского первенства по футболу среди команд первой лиги.



В атаке

Слонимским юношам 2000 года рождения противостояли сверстники из пинской СДЮШОР №3.

Игра разделилась на два разных тайма. В первой половине встречи на поле доминировали гости. Три безответных мяча они провели в ворота Владислава Бубнова.

С приходом второго тайма игра видоизменилась. Быстрый гол в ответку провёл Александр Малиновский после выверенной передачи Вильгельма Берга. Вскоре коварный удар со штрафного наносит Олег Циунчик, и только кончиками пальцев голкипер пинчан переводит мяч на угловой. Выход тет-а-тет с вратарём приезжих футболистов Александра Малиновского и Егора Кота заканчивается победой вратаря. Время шло, а голов больше никто не сумел забить.

Второй матч среди игроков 1998 года рождения показал, что лучше были готовы к игре хозяева поля. И лишь расточительство моментов, созданных вблизи ворот гостей, не позволило слонимчанам одержать победу. Первыми успех праздновали полешуки. Они исправили ошибку защитной линии и точно пробили по воротам — 0:1.

Долго хозяевам пришлось наседать на ворота и доказывать, что это лишь случайность. В итоге Сергею Мандрыку удался точный удар с пенальти. Ничья. 1:1.

Егор ЖИГАЛИК
Фото автора

ЮНОШЕСКОЕ ПЕРВЕНСТВО ОБЛАСТИ ПО ФУТБОЛУ

СТАЛИ ЧЕМПИОНАМИ

В областном центре с 28 сентября по 1 октября проходило первенство Гродненской области по футболу среди ДЮСШ, СДЮШОР юношей 2001 года рождения и моложе.

На старт вышли 12 коллективов, которые были разделены на 4 группы. В соперники слонимской ДЮСШ №1 достались команды Зельвы — 8:0 (отличились Дмитрий Ремез, Александр Панов по 2, Кирилл Слезник, Эдуард Кононович, Вильгельм Берг, Алексей Чернодаров) и Волковыска — 2:2 (Эдуард Кононович — 2).

Если в первой игре наши юноши не встретили должного сопротивления, то во втором матче слонимчане уступали по ходу поединка 0:2. После встряски в перерыве команду во втором тайме как подменили. Слонимчане заиграли быстро и комбинационно. Мяч быстро доставляли в район штрафной площади, где порой становилось жарко, но голы были забиты с дальнего расстояния. Оба точных удара с 30-40 метров нанёс центральный защитник Эдуард Кононович.

Встреча между нашими соперниками по группе закончилась победой волковычан — 4:0. Это означало, что слонимчане сыграют в полуфинальной игре с командой Лиды.

Встреча с лидчанами прошла под диктовку юных футболистов Слонима, которые создали несколько верных моментов для взятия ворот, но отличились однажды. Точный удар головой нанёс Дмитрий Близнюк.

В финальном поединке слонимчанам противостояли сверстники СДЮШОР «Неман». Уже на второй минуте хозяева сумели распечатать ворота приезжих футболистов. Ещё несколько ударов отразил наш голкипер Егор Юргель. Гости в первой половине игры боролись не только с соперниками, но и с ветром. Они пытались проводить атаки низом, что позволило дважды создать угрозу воротам гродненцев.

После перерыва всё изменилось, и уже слонимчане подолгу стали контролировать мяч. Точный удар Артёма Апанасевича дал шанс бороться за чемпионство. После того как счёт стал равным,



Команда слонимской ДЮСШ №1

наши земляки упустили два верных момента одержать победу в основное время. В серии пенальти победу праздновали юные футболисты слонимской ДЮСШ №1 — 4:2 (Э. Кононович, Д. Близнюк, Д. Ремез, Е. Юргель). Наш вратарь Егор Юргель отразил два пенальти, а потом сам нанёс решающий победный удар.

После победы в первенстве области команда ДЮСШ №1 под руководством тренеров Руслана Корнева и Андрея Молчанова проследует на республиканские соревнования.

Егор ЖИГАЛИК
Фото автора

ДУША Ў ПАЛОНЕ МУЗЫКІ

Вельмі пашанцавала нядаўна вучням і выкладчыкам Дзятлаўскай музычнай школы, а таксама тым жыхарам горада, якім удалося пабываць на канцэрце сусветна вядомых музыкантаў Івана Карызны і Кірыла Кедука.

У гэтых таленавітых маладых людзей, так бы мовіць, карэнні з нашага раёна. Іван з вялікім майстэрствам выконваў музычныя творы на віяланчэлі, а Кірыл — на фартэпіяна.

Музыка захапіла ў палон людскія душы і ўзнесла іх да вышыняў вялікага мастацтва. Цяпер гэтыя выдатныя музыканты робяць турнэ па Еўропе: Галандыя, Польшча, Германія, Літва і іншыя краіны, але найбольш яны парадуюць сваім выканаўчым майстэрствам жыхароў роднай Беларусі: дадуць 28 канцэртаў.

Цяпер у раённым Доме культуры рамонт, таму канцэрт давялося ладзіць у невялікай зале музычнай школы.

Будзем спадзявацца, што некалі зможам паслухаць музычныя творы ў іх выкананні ў вялікай зале. Такое шчасце многім жыхарам нашага маленькага гарадка выпадзе, бадай, адзін раз у жыцці.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

І КАЛГАСУ ДАПАМОГА, І САБЕ ПАДТРЫМКА

Кожную раніцу можна ўбачыць, як вялікія групы людзей адпраўляюцца з райцэнтра на калгасныя палеткі ўбіраць бульбу. У прыватнасці, многія ездзяць у СВК «Хвінявічы» і «Русь-Агра».

Гэта жанчыны і мужчыны, пенсіянеры і людзі больш маладога веку. Яны добра дапамагаюць сяльчанам, ды і для сямейнага бюджэту вялікая падтрымка, бо за працу на палетках добра плацяць. А хто хоча, то яшчэ і па невялікай цане можа купіць у гаспадарцы бульбу.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

ЗАЛАТЫЯ ЛЫЖАЧКІ

Пахаваўшы напрадвесні жонку, стары Марцін Садкоўскі з Гаркачоў пачуваўся так, нібы з яго душу вынялі: не хацелася жыць, нават штосьці рабіць па гаспадарцы. А потым пачаў даймаць боль у сэрцы. Адзіная дачка Кацярына, якая з сям`ёй жыла ў Мінску, мелася забраць да сябе і пакласці ў сталічную бальніцу. Маўляў, там хутчэй падлечаць, але Марцін катэгарычна адмовіўся:

— Не хачу я ні ў якую бальніцу. Паміраць трэба...

— Памрэш, тата, не тады, як уздумаецца, а калі пара прыйдзе. Давай цябе хоць у раённую бальніцу пакладу.

— От прычапілася...

Толькі тыдзень змог там вытрымаць стары, і, бадай, не было таго дня, каб не прасіў у дачкі, якая сядзела пры ім, лічы, не адыходзячыся:

— Завязі мяне дадому, Кацярынка... Хачу памерці ў сваёй хаце на сваёй пасцелі...

І яна паслухала. Цёплым сакавіцкім днём прывезла бацьку дадому, а перад заходам сонца яму стала зусім кепска. Гаварыў ужо ціхім голасам, і каб зразумець, трэба было ледзь не па губах чытаць.

— Дачушка, я ж забыўся... У двары пад сцяной, а дакладней, пад акном, што бліжэй да ганку, закапаны тры залатыя лыжачкі. Яны ў прамасленай паперы і ў жалезнай скрыначцы. Гэтыя лыжачкі ў час вайны дала маёй матулі адна габрэйка за тое, што зберагла ад смерці. Матуля зберагла, дык іншыя выдалі немцам. Знайшліся такія... Адкапай і забяры сабе...

Гэта былі ці не апошнія словы старога Марціна. За клопатамі аб пахаванні, за жалобай і слязамі Кацярына зусім забылася пра тыя лыжачкі, як усё адно Бог памяць адняў. Не ўспомніла і тады, калі, праз паўгода стаўшы спадкаемцам, прадала хату нейкім мінчанам на дачу. А тыя неўзабаве сталі перабудоўваць яе на свой лад. І толькі ў канцы лістапада, калі надыходзіў яе юбілейны, шасцідзясяты дзень нараджэння і калі дачка з зяцем сказалі, што падораць залаты пярсцёнак, нечакана ўспомніла пра залатыя лыжачкі. Кацярыну аж кінула ў халодны пот. І ўжо ёй было не да таго юбілею і святкавання. Ледзь пераждала ноч і раніцай села ў першы цягнік, што ішоў да іхняга райцэнтра. З яго да вёскі аўтобус быў толькі на заўтра, а сёння пешшу трэба адмерыць сямнаццаць кіламетраў. Але што для яе тыя кіламетры, калі не магла ўсядзець, калі нават на валасінку ноччу не заснула.

— Гэта ж трэба забыцца пра такі скарб! Пярсцёначак яны мне падораць! Ды там золата не дзвесце такіх пярсцёначкаў, — бубніла сама сабе, ідучы па калдобістай лясной дарозе. — Чорта я цяпер знайду лыжачкі. Яны недзе адкапалі і забралі, тыя дачнікі. Не маглі не знайсці, капаючы там усё ўздоўж і ўпоперак. Каб мелі сумленне, то адразу аддалі б, ведаючы жа, што чужое. Ды цяперашнім светам захацела ты нейкага сумлення ў людзей знайсці. Тут за бутэльку гарэлкі, бывае, чалавека заб`юць, дзеці бацькоў не шкадуюць...



У вёску яна прыйшла надвячоркам. Думала, можа, і няма тут дачнікаў, бо дачны ж сезон даўно закончыўся, ажно не: у двары ладзіў плот новы гаспадар.

Павітаўшыся, Кацярына папрасіла ў яго лапату і пачала капаць у тым месцы, дзе павінны быць лыжачкі. Мужчына няўцямнаназіраў за ёй.

— Чаму вы тут капаеце? Шукаеце што-небудзь?

— А ты не ведаеш?! — агрызнулася Кацярына. — Канешне, шукаю, але ўжо, напэўна, не знайду, бо другія знайшлі і прыхавалі.

— Пра што вы кажаце?

— Пра што?! Пра залатыя лыжачкі! Тры залатыя лыжачкі былі закапаны вось тут. У прамасленай паперы, у металічнай скрыначцы. Ты забраў, як перасыпаў хату, ці хто-небудзь з тваіх памагатых?

— Ні пра якія лыжачкі я не ведаю... — разгублена прамовіў мужчына.

— Пэўна, цяпер ты не ведаеш! Цяпер ты ўжо не прызнаешся, каб нават паставілі на гарачае вуголле. Гэта ж каму скарб! Але я іх з цябе вытрасу! У суд падам! — Кацярына ўжо не гаварыла, а крычала на ўсю ваколіцу.

Толькі ў выміраючай вёсцы яе мала хто чуў. А калі і чулі, то старыя не прыйшлі. Гэта не некалі, што на любы крык збіраўся народ. Толькі суседка Валя Карповіч, так бы мовіць, навастрыўшы вушы, стаяла на сваім надворку. Каб лепш чуць, ссунула з левага вуха канаплянку, але ў размову не ўмешвалася.

А Кацярыну ўсё адно як ад розуму адбіла. Размахваючы лапатай, яна рушыла да гаспадара:

— Заб`ю! Хоць перад смерцю ў граху прызнайся!

Мужчына спрытна падскочыў да звар`яцелай кабеты і выхапіў з рук лапату.

— У міліцыю здам, там будзеш зеляпаніць! Уварвалася на чужую сядзібу, нешта тут шукае ды яшчэ пагражае.

— Сціхнеце абое і не гнявіце Бога! — не вытрымала ўжо Валя. — Я ведаю пра тыя лыжачкі, але яны вам не дастануцца. Аднойчы Марцін, калі была яшчэ жывая твая, Кацярына, маці, і якая ні сном ні духам не ведала пра такі скарб, на добрым падпітку прагаварыўся ў хаце Мані Сакольчык. Мы тады прывезлі з лугу сена і замочвалі яго. То ён сказаў ды яшчэ папярэдзіў, каб жонцы не данеслі. Вядома ж, п`яны. Я падумала: чаўпе абы-што. А Маня неўзабаве праверыла. «Ёсць лыжачкі, не маніў Марцін, — сказала мне па сакрэту. — Я адкапала ды сабе забрала. Лыжачкі дастала, а скрыначку, у якой былі, пакінула. Ён жа, як будзе часам правяраць, то да скрыначкі дакапаецца ды супакоіцца, маўляў, усё на месцы».

— Дык Маня ж памерла яшчэ раней за нашага бацьку...— зніякавела Кацярына. — І навошта ёй тыя лыжачкі? Жыла адна, як вецер у полі: ні дзяцей, ні ўнукаў.

— А яна казала, што за такое багацце яе і пляменнікі дагледзяць да смерці. Сястрыны дзеці жывуць у розных гарадах Расіі. Ды выйшла так, што і даглядаць асабліва не трэба было. Галава забалела. Паляжала ў бальніцы і праз тыдзень аддала Богу душу. А пляменнікі, праўда, адразу прыехалі, як пазванілі, што хворая. І з Сібіры, і з Урала, і з Мурманска. Так што супакойся, Кацярына, не спадзявайся на тое золата і жыві як жыла. І чалавека гэтага не абражай, бо ён не вінаваты... Праўду такі людзі кажуць, што ад золата на свеце шмат зла. Не ведала ты пра яго, дык і жыла нармальна, а як даведалася, то нібы чорт у душу ўсяліўся, — Валя з гарычы махнула рукой і пасунулася ў сваю хату.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ЛЁСЫ ЛЮДСКІЯ

ВОСЕМ ПРАМЕНЬЧЫКАЎ ШЧАСЦЯ



Ірына Загдай

—О, у маладосці я шмат дзе пабывала, бо прафесію маю цікавую! — Ірына Аляксандраўна гутарыць са мной, не адрываючыся ад справы: парадкуе на кухні малако. — Пасля вайны закончыла курсы праваднікоў, якія тады былі ў Баранавічах, і паехала па размеркаванні ў Свярдлоўск. Увесь Урал аб`ехала пад стук колаў... Пачакайце, вось зараз вынесу слоікі ў кладоўку і буду расказваць далей. Ідзіце ж бо ў залу.

Я пераступіла парог вельмі чыстага і ўтульнага пакоя. У ім шмат кветак: фікусы, балгарская ружа і многа іншых, назвы якіх нават не ведаю.

—Люблю кветкі, — перахапіла мой погляд гаспадыня. — Цяпер у агародчыку цвітуць вяргіні, а гэтыя не цвітуць, але растуць высокія.

—І як Вам жылося на Урале? Сумавалі па роднай вёсцы?

—Не сказаць, каб надта сумавала, але ўспамінала часта. А жылося добра, бо работа вельмі цікавая. Ды і кавалер неўзабаве у мяне з`явіўся. Косця Загдай прыехаў у гэты далёкі край з нашага раёна. Там мы пазнаёміліся, там і пажаніліся. Ён працаваў на будоўлі. Пажылі на Урале, а потым вырашылі вярнуцца на Дзятлаўшчыну, а дакладней, у маю родную вёску Сачыўляны. Муж пачаў працаваць у калгасе будаўніком, а мяне прызначылі звеннявой ільнаводчага звяна.

У Сачыўлянах нарадзіўся іхні першынец Міша, а за ім на свет з`явіліся Коля, Сярожа, Валік, Лёша. А потым Загдаі надумалі пабудаваць дом у Дзятлаве. Узялі ўчастак у завулку Фогеля. У добрым месцы пабудавалі яны свой дом. Тут нарадзіліся два хлопчыкі, Андрэй і Вася.

— Канешне, сыночкі добра, але я вельмі хацела дачушку, — кажа Ірына Аляксандраўна, і на яе мілым твары свеціцца ўсмешка. — І Бог пачуў мае малітвы: Свету я нарадзіла, калі падбіралася пад сорак.

Такую вялікую сям`ю мелі яны з мужам: восем дзетак, восем праменьчыкаў шчасця.

Калі крыху маленькія падраслі, мама пайшла ў школу прыбіральшчыцай, а потым працавала швачкай у райбыткамбінаце.

Дзеці ў Загдаяў выраслі ўдалыя ды працавітыя. Праўду кажуць у народзе: дзе сем, там і доля ўсім. Кожны знайшоў сваё месца ў жыцці. Валянцін жыве ў Краснадарскім краі. Ён авіятар. Аляксей будуе дамы ў Геленджыку. Коля — электрык, Сярожа працуе на пагрузчыку ў дарожна-будаўнічай арганізацыі, Вася — будаўнік, Света — на хлебазаводзе. Хто жыве ў Дзятлаве, а хто ў недалёкай вёсцы. Усе маюць свае сем`і.

Ірына Аляксандраўна зведала ў сваім жыцці шмат радасці, але і гора яе не абмінула. Не стала мужа. У маладым веку памёр самы старэйшы сынок, Міша. Андрэйка, прыгожы, удалы хлопец, з ранняга дзяцінства пры бацьку навучыўся выконваць усе будаўнічыя работы. Вельмі любіў гэтую справу. У вызначаны час пайшоў у Савецкую Армію, а адтуль вярнуўся без здароўя. Але і цяпер не сядзіць без справы, яго ўмелыя рукі шукаюць і знаходзяць сабе занятак. На яго работу хораша глядзець.

Ірына Аляксандраўна — багатая бабуля:

— Я ужо маю шаснаццаць унукаў і аднаго праўнука, якога назвалі Мікіткам, — радуецца яна.

Нядаўна гэтай мілай жанчыне споўнілася восемдзесят адзін год. Яна, бадай, адзіная ў нашым гарадку трымае карову. Сенаваць, канешне, дзеці дапамагаюць, а ўсё астатняе робіць сама. А гэтага астатняга ого як шмат! І накарміць, і падаслаць, і падаіць. Малако ўпарадкаваць ды разнесці яго заказчыкам. А іх у Ірыны Аляксандраўны дванаццаць. І ўсе жывуць у розных кутках Дзятлава. Пакуль разнясе — то амаль паўдня пройдзе. Больш як па дзесяць кіламетраў праходзіць пешшу кожны дзень. А інакш не атрымліваецца, бо ў нас няма гарадскога аўтобуса. Носіць малако старым людзям, інвалідам, тым, каму цяжка хадзіць.

І ўявіце сабе: жанчына, якой восемдзесят адзін год, штодзень крочыць па вуліцах з сумкай, у якой бутэлькі з сырадоем, але не лічыць, што ёй цяжка. Можа, таму, што шмат працуе, яна без перабольшвання, выглядае на дваццаць гадоў маладзейшай за сваіх равесніц. Невысокая, хударлявая, жвавая. І ніякіх трэнажораў не трэба, каб быць спрытнай. Я заўсёды захапляюся ёй. Ды і не толькі я.

— Можа, вы ўжо збывалі б карову, а то цяжка, — іншы раз кажуць суседкі.

— Ну, зараз! — незадаволена мовіць Ірына Аляксандраўна. — І што я тады буду рабіць? Сядзець ля акна ці ў тэлевізар узірацца? Яшчэ ж і цялушачку гадую ад сваёй каровы. Курэй трымаю. Квактуха выседзела куранятак ды кінула, вадзіць не хоча. Во з імі клопату! Але мне не прывыкаць.

Дзеці мне таксама кажуць:

— Прадавай, мама, карову, дык хоць адпачнеш. А ён мне патрэбен, такі адпачынак? Ды я без работы задыхнуся, як рыба без вады. Вядома ж, усё жыццё так пражыла і, дзякуй Богу, добра сябе адчуваю.

У Ірыны Загдай зайздросны характар: яна не ўмее ныць і скардзіцца на цяжкасці. Яна іх проста ігнаруе. Інакш хіба змагла б нарадзіць і выгадаваць васьмярых дзетак? Хіба магла б у восемдзесят адзін год выглядаць на зайздрасць тым, што сядзяць на розных дыетах і не вылазяць з трэнажорных залаў?

Цаны Вам няма, мілая Ірына Аляксандраўна!

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ
Фота аўтара

ДЯТЛОВО. НОВОСТИ

РУКОВОДИТЕЛИ ДЯТЛОВСКОГО РАЙИСПОЛКОМА ПРИШЛИ В ХРАМ

Руководители всех структур и отделов Дятловского райисполкома во главе с его председателем Иваном Крохмальчиком на прошлой неделе посетили православный храм Иоанна Кронштадтского в селе Охоново под Дятловом.

Настоятель храма протоиерей Валерий Мануйло рассказал светским чиновникам об истории храма, а также о современных буднях прихода, сообщает христианский информационный портал krynica.info.

В этот же день викарий Новогрудской епархии епископ Дятловский Петр по случаю дня молитвенного поминовения святой мученицы Людмилы, жившей на рубеже IX—X веков в Сербии, приехал в одноименный храм в селе Клепачи под Слонимом, где возглавил Божественную Литургию в сослужении настоятеля храма иерея Олега Минича.

Наш корр.

ЗАТРЫМАНЫ МАЛАДЫ ЧАЛАВЕК, ЯКІ НАПАДАЎ НА МАЛЫХ ДЗЯЎЧЫНАК

У Дзятлаве аператыўнікамі мясцовага райаддзела міліцыі пры падтрымцы калегаў з упраўлення ўнутраных спраў УУС Гродзенскага аблвыканкама затрыманы падазраваны ў гвалтоўных дзеяннях сексуальнага характару мясцовы жыхар 1992 года нараджэння.

Як паведамляе УУС Гродзенскага аблвыканкама, малады чалавек у глухім месцы падпільнаваў малалетнюю дзяўчынку, вучаніцу адной з мясцовых школ, якая накіроўвалася раніцай на факультатыў па вакале. Пад падставай просьбы дапамагчы знайсці збеглага ката малады чалавек апынуўся ў непасрэднай блізкасці каля дзіцяці, пасля чаго схапіў, паваліў на зямлю, закрыў рукой рот і стаў цалаваць. Невядома, чым бы ўсё завяршылася, калі б гвалтаўніка не спудзілі прахожыя.

Школьніца расказала пра ўсё педагогу. Жанчына паведаміла бацьку, той звярнуўся ў міліцыю. Былі праведзены аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, падчас якіх была ўстаноўлена асоба падазраванага.

Малады чалавек афіцыйна працуе дворнікам, а ў вольны час дапамагае ў адным з мясцовых касцёлаў. Падчас гутаркі аператыўнікаў з падазраваным высветлілася, што на яго сумленні яшчэ адзін факт такіх супрацьпраўных дзеянняў. Яшчэ летам, знаходзячыся ў абласным цэнтры з мэтай здачы экзаменаў у духоўную семінарыю, хлопец напаў на дзяўчынку на вуліцы Індустрыяльнай. Як і ў папярэднім выпадку, у палаву сувязь з пацярпелай ён не ўступаў. У Гродне малады чалавек жыў у бабулі, якая нічога не падазравала пра яго схільнасць.

БелаПАН

ПРАБЛЕМА

ЗАКРЫЦЦЁ ШКОЛ ЯК ПАКАЗЧЫК ВЫМІРАННЯ ВЁСКІ

На сённяшні дзень сітуацыя ў сістэме адукацыі такая. У Мастах існуюць чатыры навучальныя ўстановы: гімназія, другая, трэцяя і пятая СШ. Чацвёртая — пачатковая, што знаходзілася на завакзаллі, зліквідавана з той нагоды, што будынак быў стары і не прыстасаваны для паўнавартснага навучальнага працэсу. Школьнікам з вёскі Малыя Сцяпанішкі да бліжэйшай школы — амаль чатыры кіламетры дарогі.

У раёне захаваліся толькі сярэднія школы. Іх адзінаццаць. А было чатырнаццаць.

За апошнія гады былі зліквідаваны Малькавіцкая і Струбніцкая сярэднія школы. Прычына адна — ненапаўнянасць класаў. А дакладней, адсутнасць дзяцей.

Гэткі ж лёс напаткаў чатыры пачатковыя школы. Не стала і сярэдняй школы імя героя Вялікай Айчыннай вайны лётчыка Чарменнага ў Чарлёне, а ў ёй выкладаў цяперашні загадчык аддзела адукацыі райвыканкама Валянцін Цехановіч.

Неўзабаве паўстане пытанне закрыцця сярэдніх школаў у Мікелеўшчыне і Галубах. У першай менш як 50 вучняў. У другой у мінулым годзе быў толькі адзін першакласнік.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ПАДЗЕЯ

ГУЎ, ШУМЕЎ КІРМАШ



Ля машыны з хвінявіцкай бульбай



«Якія авечачкі!»



«Прымакі» смакуюць шашлыкі



Вясёлы падворак

На дзятлаўскім рынку прайшоў восеньскі кірмаш.

У гэту суботу яшчэ зацемна сюды пачалі з`язджацца машыны з усіх куткоў раёна. Яны прывезлі розную сельскагаспадарчую прадукцыю, вырашчаную на палях, у садах і нават у хлявах. Напрыклад, СВК «Хвінявічы» парадаваў пакупнікоў бульбай, морквай, цыбуляй і мясам трусоў, якія вырошчваюцца на ферме ў вёсцы Руда-Яварская. Невыпадкова таму да іхніх машын спяшаліся людзі.

Амаль насупроць хвінявіцкіх гаспадароў ля грузавой машыны месцілася скрыня, а ў ёй стаялі вялікія сытыя авечкі. Пакупнікі прыцэньваліся, прыглядваліся. Вельмі спадабаліся авечкі і дзецям, якія разам з бацькамі прыйшлі на кірмаш. Яны прасоўвалі праз агароджу ручкі, хацелі пагладзіць.

—Што, падабаюцца? — спытаў гаспадар авечак.

—Падабаюцца...

—Адкуль вы прывезлі такіх кудлаценькіх? — пытаю. — Вялікія, воўна густая...

— А мы з Наваельнянскага камбіната хлебапрадуктаў. Гэта авечкі спецыяльнай мясной пароды. І воўна ў іх выдатная, і мяса смачнае. Купляйце!

—Няма дзе трымаць, а так бы з задавальненнем.

Над кірмашом віўся пахучы дымок. Гэта на мангале смажыліся шашлыкі. Іх прыйшлі пасмакаваць артысты з гурта «Прымакі».

Капуста і рыба, яблыкі розных гатункаў, кандытарскія вырабы і шмат што іншае прывезлі на продаж жыхары Дзятлаўшчыны і нават навакольных раёнаў.

—Ідзі рыбу купляй! Гэты чалавек мае прыватнае возера і такую рыбку вырошчвае. Я не раз у яго брала, таму і раю, — кажа адна кабета другой.

Прыгажуні ў беларускіх нацыянальных строях пабудавалі на кірмашы дзівоснае падвор`е. Іх умелыя рукі і фантазія стварылі з агародніны і садавіны розных звяркоў. Гэтыя дзяўчаты прыехалі з СВК «Граніт-Агра», лічы, з самага аддаленага кутка раёна.

Уздоўж плоту роўненькім радком выстаўлены маладыя дрэўцы: яблынькі, грушы, слівы, вішні і многае іншае. Усё, што душа жадае ды кашалёк дазваляе.

А якія песні гучалі на канцэртнай пляцоўцы, якая музыка! Нават пахмурная восеньская раніца стала яснейшай, цяплейшай.

Людзі казалі, што гэта толькі першы кірмаш у нашым прадку, што яны будуць праводзіцца і яшчэ. Мауляў, той, хто не паспеў набыць патрэбную агародніну і садавіну, можа не засмучацца: яшчэ купіць.

Нягледзячы на тое, што сёлетняе лета было засушлівае, ураджай на палетках і ў садах вырас добры. Не сам па сабе, канешне, а дзякуючы руплівым і ўмелым рукам вяскоўцаў. Нізкі паклон ім за гэта!

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ
Фота аўтара

НАВІНЫ МАСТОЎШЧЫНЫ

АГІТАЦЫЯ БЕЗ АГІТАЦЫІ

Не так і многа часу застаецца да дня выбараў прэзідэнта РБ. Гэтая перадвыбарчая кампанія на Мастоўшчыне адметна ад мінулых адсутнасцю агітацыі і агітацыйных матэрыялаў.

Толькі на дошцы аб`яў на краме «Верас», што на праспекце Юнацтва, можна пабачыць плакат з выявай беларускага казачага атамана Улаховіча. Агітацыйныя матэрыялы за Караткевіч і Гайдукевіча адсутнічаюць, як і няма за іх вуснай агітацыі. Не сустрэць на вуліцах і плакатаў, якія заклікаюць галасаваць за Лукашэнку, але іх можна пабачыць у крамах, канторах і г. д.

Місія агітацыі за Лукашэнку на Мастоўшчыне даручана Герою Беларусі Васілю Равяку, які быў апошнім сакратаром мясцовага райкама партыі. Яму даводзіцца выступаць перад нешматлікай аўдыторыяй, калектывамі арганізацый і ўстаноў.

Не прамінуў Васіль Афанасьевіч выступіць перад настаўнікамі і тэхперсаналам гарадской гімназіі. Выступ доўжыўся амаль гадзіну перад аўдыторыяй у 30 чалавек. Увесь гэты час Равяка распавядаў пра поспехі сельскай гаспадаркі, якую ён узначальвае з 1995 года, і заклікаў галасаваць за Лукашэнку.

Тым часам настаўнікі, медыкі, супрацоўнікі міліцыі, МНС, аховы і іншыя службоўцы ў адкрытую кажуць, што ўжо зараз іх абавязваюць галасаваць датэрмінова.

ДАБРО АБКЛАДАЕЦЦА ПАДАТКАМ

У незвычайную сітуацыю трапілі работнікі мастоўскай ЖКГ. За аказаную паслугу з іх спаганяюць падаткі.

Нядаўна адбыўся капітальны рамонт пад`ездаў дома №12 на праспекце Юнацтва. Паводле праекта прадугледжвалася аднаўленне ганкаў і фарбаванне пад`ездаў толькі да другога паверха.

Жыхары аднаго з пад`ездаў пажадалі, каб быў адноўлены пад`езд цалкам. За ўласныя сродкі яны набылі неабходныя матэрыялы, а рабочыя ЖКГ выканалі належную працу. За яе з імі разлічыліся жыхары пад`езда.

Тое стала вядома супрацоўнікам падатковай інспекцыі. Апошнія, у сваю чаргу, запатрабавалі, каб з тае сумы рабочыя сплацілі падаткі.

МАСТОЎСКАЯ БАКТЭРЫЯЛЬНАЯ ГНІЛЬ ПАСТУПАЕ Ў РАСІЮ

Згодна з паведамленнем Рассельгаснагляду, кальцавая бактэрыяльная гніль бульбы, што вырошчваецца ў Беларусі, распаўсюджана ў 28 раёнах. Сярод іх і Мастоўскі.

Праблемы ў мастоўскіх вытворцаў харчовых тавараў з расійскімі кантралюючымі органамі былі і раней. Амаль два гады знаходзілася пад забаронай паставак у Расію прадукцыя прадпрыемства «Мастоўскі кумпячок». Забарона была знята толькі сёлетняй вясной.

ПАДАРУНАК «ЕЎРААПТА» ПАЖЫЛЫМ ЛЮДЗЯМ



У Міжнародны дзень пажылых людзей, 1 кастрычніка, мастоўскі «Еўраапт» для пенсіянераў зрабіў 5%-ю зніжку на ўсе тавары.

Гэта ўсебеларуская акцыя. Яна дзейнічала з 9.00 да 15.00 гадзін.

Умовай атрымання зніжкі стала прад`яўленне на касе пры разліку пенсійнага пасведчання ці дысконтнай карты «Е-плюс. Пенсійная».

Такая дысконтная карта стала даступнай для пакупнікоў гэтай катэгорыі ва ўсіх рэгіёнах краіны з 1 верасня. Па ёй тавары з 3%-й зніжкай можна набыць у будныя дні з 9.00 да 15.00.

Аднак, як адзначылі работнікі крамы, у гэты дзень асаблівага наплыву пакупнікоў не назіралася.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЗДАРЭННЕ

ПАГОНЯ З АХВЯРАМІ

Вынікам пагоні за дзяўчынай стала дарожна-транспартнае здарэнне і смерць пасажыра.

Кампанія мастаўлян адпачывала на адным з азёраў Мастоўшчыны. У адной дзяўчыны ўзнік канфлікт з адпачывальнікамі, і яна патэлефанавала знаёмаму з просьбай забраць яе.

Два хлопцы вырашылі вярнуць яе і паехалі даганяць. П`яны кіроўца «Аўдзі» ў вёсцы Зарудаўе на павароце не справіўся з кіраваннем, і машына ўехала ў жалезабетонную агароджу і дарожны слуп.

Не прышпілены пасам бяспекі пасажыр на пярэднім сядзенні памёр на месцы.

Узбуджана крымінальная справа.

Язэп ПАЛУБЯТКА

Группа №5 УП «Проектный институт «Гродногипрозем»
Начальник, инженер, техники 6-56-83

КУДП «УКС Слонимского района»
Директор, приёмная 6-69-55
Главный бухгалтер 6-69-56
Ведущий экономист 6-69-53
Инженеры 6-69-54, 6-69-57

Отдел статистики Слонимского района
Начальник 5-09-35
Заместитель начальника 5-09-30
Главные экономисты 5-09-32, 5-09-25, 5-09-07

Представительство Белгосстраха
Директор 6-59-37
Заместитель директора 6-59-33
Главный бухгалтер 6-59-29
Отдел страхования 6-59-34
Отдел страхования несчастных случаев 6-59-32
Сектор урегулирования убытков 6-59-28

Слонимская городская и районная инспекция природных ресурсов и охраны окружающей среды
Начальник 5-49-57
Главные специалисты, ведущий специалист 5-35-63

Слонимская межрайонная инспекция охраны животного и растительного мира
Начальник 6-63-65

Слонимская проектно-конструкторская мастерская УП «Гродножилпроект»
Заведующий, главный инженер проекта 6-75-16
Проектная группа 6-75-17

Слонимское межрайонное отделение торгового РУП «Гроднооблсоюзпечать»
Начальник 6-63-71
Бухгалтер 6-63-72
Организатор розничной продажи 6-63-73

Слонимский районный отдел Гродненского областного управления Фонда социальной защиты населения
Начальник 5-50-09
Заместитель начальника 5-52-90
Главные инспекторы 5-91-22, 5-52-91, 5-16-97, 5-23-18

Слонимский районный узел почтовой связи
Начальник 6-54-01
Заместитель начальника 6-54-00
Ведущий бухгалтер 6-54-04
Ведущий экономист 6-64-03
Организатор розничной продажи 6-53-94
Специалист по кадрам 6-54-02
Отдел подписки 6-53-99

Слонимский районный узел электрической связи
Начальник 6-12-40
Приёмная 6-14-40
Ведущий инженер 6-31-77
Ведущий бухгалтер 6-31-71
Ведущий экономист 6-31-91
Начальник УПУ 6-11-80
Начальник ЛТУ 6-31-90

Слонимский участок производственного унитарного предприятия «Гродновторчермет»
Мастер участка 3-13-93

Слонимский цех «УКВР Гродненского областного узла радиовещания и телевидения»
Начальник 5-00-37
Дежурный 2-49-75, (факс) 2-50-05

Слонимский филиал РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»
Начальник 6-28-98
Заместитель начальника 6-28-95
Главный бухгалтер 6-28-97
Бухгалтерия 6-28-93
Отдел кадров (факс) 6-28-96
Служба производственного архива (факс) 6-28-90
Служба приёма и выдачи заказов (факс) 6-28-90
Служба регистрации 6-28-91, 6-28-92
Служба технической инвентаризации 6-28-94, 6-29-52
Геодезисты 6-29-51
Оценщик недвижимости 6-29-53

Унитарное проектно-производственное архитектурно-планировочное предприятие Слонимского райисполкома
Начальник 4-66-63
Главный бухгалтер 4-66-63
Инженер-проектировщик 6-56-34

Учреждение «Редакции объединённой газеты «Слонимский вестник»
Главный редактор 5-01-02
Заместитель главного редактора 5-01-09
Главный бухгалтер, редактор отдела рекламы 5-01-13
Ответственный секретарь, редактор отделов экономики, спорта и туризма 5-01-10
Редакторы отделов писем и обращений граждан, информационно-аналитического 5-01-12
Отдел радиоинформации 5-01-14

Список номеров телефонов подготовлен по материалам газеты «Слонимский вестник»

8

НОМЕРА СЛУЖЕБНЫХ ТЕЛЕФОНОВ

ТЕЛЕФОННЫЕ НОМЕРА ЭКСТРЕННЫХ СЛУЖБ

Пожарная аварийно-спасательная служба — **101**
Милиция — **102**
Скорая медицинская помощь — **103**
Аварийная служба газовой сети — **104**
Справочная о номерах телефонов Республики Беларусь — **109**
Справка о номерах экстренных служб по Республике Беларусь — **199**



БАНКИ

Отделение ОАО «Белпромстройбанк» в г. Слониме
Отдел клиентского сервиса 5-97-83
Отдел по работе с физическими лицами 5-99-57, 5-49-01
Отдел автоматизации 5-49-09

Расчётно-кассовый центр №27 г. Слоним филиала ОАО «Белагропромбанк» — Гродненское областное управление
Начальник 6-59-46
Заместитель 6-59-56
Заместитель начальника РКЦ 6-68-12
Начальник отдела активных банковских операций 6-59-48
